# Научная жизнь

# Навуковае жыццё

# Scientific events

## БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ КРУГЛЫЯ СТАЛЫ

## BELARUSIAN-POLISH ROUND TABLES

Адной з галоўных задач у галіне гісторыі з моманту абвяшчэння незалежнай Рэспублікі Беларусь з'яўлялася стварэнне паўнавартаснай канцэпцыі гісторыі беларускага народа. Не кожнае пакаленне гісторыкаў сутыкаецца з пытаннямі, вырашэнне якіх патрабуе настолькі грунтоўнай працы. Можна казаць, што на працягу апошняга дваццацігоддзя асноўныя канцэптуальныя палажэнні гісторыі беларускага народа былі распрацаваны дзякуючы правядзенню навуковых даследаванняў, удзелу вучоных у канферэнцыях і знайшлі адлюстраванне ў абагульняючых працах і падручніках па гісторыі.

Але не менш істотная задача гістарычнай навукі заключаецца ў тым, каб не толькі распрацаваць канцэптуальныя падыходы, але і пазнаёміць з імі прадстаўнікоў навуковых гістарычных школ суседніх краін. Успрыманне суверэннай дзяржавы непарыўна звязана з бачаннем гісторыі яе народа. Без прэзентацыі гісторыі Беларусі ў замежным навуковым асяроддзі немагчыма дасягнуць разумення ў грамадскай думцы суседніх краін незалежнага існавання сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Замацаванне ў свядомасці суседзяў гістарычнага лёсу беларускага народа будзе адбывацца яшчэ на працягу не аднаго дзесяцігоддзя.

Безумоўна, менавіта з польскай гістарычнай традыцыяй мы маем, бадай, найвялікшую колькасць спрэчных, цяжкіх для ўспрымання, двухбакова не абмеркаваных пытанняў.

Доўгі час пры правядзенні навуковых канферэнцый неаднаразова выяўлялася існаванне розных падыходаў беларускіх і польскіх даследчыкаў да пытанняў, звязаных з гісторыяй абедзвюх дзяржаў. Часам у навуковых дыскусіях атрымлівалася прыходзіць да пэўных узгодненых пазіцый, якія, аднак, не мелі працягу ў навуковых даследаваннях і не рабіліся набыткам грамадскай думкі ў Беларусі і Польшчы. У сувязі з гэтым узнікла ідэя арганізацыі і правядзення рэгулярных беларуска-польскіх навуковых сустрэч, якія праходзілі б не толькі як абмен думкамі, але і мелі б лагічны працяг у выглядзе публікацый і адлюстравання ўзгодненых пазіцый у навуковых і вучэбных выданнях, грамадскай думцы і ацэнках дзвюх краін. Падобная навуковая пляцоўка павінна адыграць вельмі важную ролю і ў абгрунтаванні ідэй беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

У гэтым годзе на гістарычным факультэце БДУ прайшлі два беларуска-польскія круглыя сталы: «Дыялог гісторыі / Гісторыі дыялогу. Складаныя пытанні ў гісторыі Беларусі і Польшчы, іх адлюстраванне ў гістарыяграфіі абедзвюх краін і перспектывы для збліжэння навуковых пазіцый» (1–2 чэрвеня 2017 г.) і «Генэзіс польскай і беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах Першай сусветнай вайны і еўрапейскіх рэвалюцый» (29 верасня 2017 г.).

Арганізатарамі гэтых круглых сталоў выступілі гістарычны факультэт БДУ, Беластоцкі ўніверсітэт і Польскі інстытут у Мінску. Яшчэ на этапе падрыхтоўкі першай сустрэчы стала відавочна, што прадстаўніцтва бакоў можа быць вельмі шырокім, таму арганізатары былі вымушаны абмежаваць колькасць удзельнікаў і ўвесці парытэтнасць, не выключаючы ў будучым магчымасці кааптацыі ўдзельнікаў з абедзвюх краін.

На адкрыцці першай сустрэчы з прывітальным словам да прысутных звярнуліся прарэктар БДУ С. М. Ходзін і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь К. Паўлік, дэкан гістарычнага факультэта прафесар А. Г. Каханоўскі, прарэктар Беластоцкага ўніверсітэта прафесар В. Сляшыньскі, дырэктар Польскага інстытута ў Мінску М. Адамскі. Ва ўсіх выступленнях прагучала думка аб наспеласці і неабходнасці правядзення падоб-

ных навуковых сустрэч, якія дазволяць даследчыкам абмеркаваць пазіцыі бакоў па найбольш вострых пытаннях у гісторыі беларуска-польскіх адносін і прыйсці да навукова абгрунтаваных, узважаных высноў.

У працы круглага стала прымалі ўдзел вядучыя спецыялісты-гісторыкі і сацыёлагі з універсітэтаў і навуковых устаноў Беларусі і Польшчы: прафесар А. Г. Каханоўскі (БДУ), прафесар І. А. Марзалюк (старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь), загадчык кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта прафесар А. А. Яноўскі, прафесар В. І. Менькоўскі, дацэнт А. А. Прохараў, дацэнт Л. А. Козік, дацэнт В. С. Макарэвіч (БДУ), загадчык Цэнтра спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі прафесар В. Ф. Голубеў, загадчыца аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў дацэнт В. В. Яноўская (Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі), дацэнт М. М. Мязга (дэкан гістарычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны), дацэнт А. І. Пашковіч (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна), прафесар Э. С. Ярмусік (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы), дацэнт У. В. Барысенка (дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова), прафесар В. Сляшыньскі, прафесар Э. Міpановіч (Беластоцкі ўніверсітэт), прафесар З. Вінніцкі, прафесар Ф. Валяньскі (Вроцлаўскі ўніверсітэт), прафесар Я. Гербўска-Калаўр (Інстытут гісторыі Польскай акадэміі навук), прафесар В. Рэзмер (Торуньскі ўніверсітэт М. Каперніка), прафесар М. Іваноў (Апольскі ўніверсітэт), прафесар Р. Радзік (Люблінскі ўніверсітэт М. Складоўскай-Кюры).

Праца круглага стала пачалася з выступлення А. Г. Каханоўскага, які даў ацэнку сучаснаму стану навуковых даследаванняў у дзвюх краінах па гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст., звярнуў увагу на праблему тэрміналогіі ў працах і неабходнасць выкарыстання кампаратывістыкі. У сваю чаргу, І. А. Марзалюк засяродзіў увагу на ролі стэрэатыпаў і міфаў ва ўспрыманні палякаў у беларускім грамадстве, а таксама падкрэсліў негатыўнае стаўленне польскай эліты ў XIX – пачатку XX ст. да беларускага нацыянальнага руху і беларускага пытання. Праблемнае поле ў даследаванні канфесійнага пытання на мяжы стагоддзяў акрэсліла В. В. Яноўская, якая заклікала прысутных да ўзважанага і аб’ектыўнага вывучэння канфесійнага складу насельніцтва беларускіх і памежных з Польшчай тэрыторый.

Выказаныя метадалагічныя ідэі і прапановы беларускіх калег былі сугучныя з ідэямі польскіх даследчыкаў. Так, В. Сляшыньскі прапанаваў засяродзіць увагу на правядзенні параўнальных даследаванняў па гісторыі нацыянальнай палітыкі Польскай рэспублікі і БССР у міжваенны перыяд. У больш вузкім аспекце гэта праблема была закранута і М. Івановым, які параўнаў розныя канцэпцыі стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы. Праблемы становішча грамадзянскага насельніцтва Цэнтральнай Еўропы ва ўмовах ваенных падзей 1919–1920 гг. акрэсліў В. Рэзмер. Ён зазначыў, што на фоне вывучэння палітычнай гісторыі і баявых дзеянняў і ў польскай, і ў беларускай гістарыяграфіі фактычна не вывучана праблема становішча грамадзянскага насельніцтва. У сваім выступленні Я. Гербўска-Калаўр звярнула ўвагу на неабходнасць выкарыстання самага шырокага кола крыніц і даследаванняў для аналізу ўзаемаадносін паміж палякамі і беларусамі ў 1914–1939 гг., што, на яе думку, дазволіць прыйсці менавіта да ўзважаных ацэнак мінулага.

Пытанні гістарыяграфіі і метадалогіі даследаванняў у вывучэнні сацыялістычнага перыяду развіцця абедзвюх краін раскрыў В. І. Менькоўскі. Даследчык адзначыў неабходнасць дэтальнага вывучэння польскай і беларускай гістарыяграфіі ў галіне саветалогіі. У сваю чаргу, А. А. Яноўскі згадаў пра тое, што беларускія даследчыкі міжваеннага перыяду займаліся гісторыяй Польшчы, а таму існуе неабходнасць прааналізаваць і пераасэнсаваць навуковыя працы таго часу.

Напрамкі развіцця даследаванняў па гісторыі міжваеннага перыяду разглядаліся ў дакладах М. М. Мязгі пра вызначэнне ролі і месца Беларусі ў палітыцы Польшчы і СССР, А. І. Пашковіч па праблеме тэрміналогіі ў вызначэнні польска-савецкай вайны, тэрыторыі Заходняй Беларусі і інш.

Неабходнасць правядзення кампаратывісцкіх даследаванняў, прычым у шырокім кантэксце, з улікам розных фактараў, падкрэсліла і Л. А. Козік. На яе думку, гэта дазволіць пазбегнуць палітызацыі навуковых даследаванняў і наблізіцца да аб’ектыўнага разумення падзей мінулага. Гэта ідэя была развіта Э. С. Ярмусікам, які заклікаў бачыць у двухбаковых адносінах не толькі «цёмнае мінулае», але і тое станоўчае, што аб’ядноўвала і аб’ядноўвае беларускі і польскі народы. Тэму працягнуў У. В. Барысенка, які падкрэсліў важнасць станоўчых прыкладаў для развіцця добрасуседскіх адносін.

На тэрытарыяльныя праблемы ва ўзаемаадносінах двух бакоў у XX ст. звярнуў увагу З. Вінніцкі. Яго думка аб тым, што ў сучасным беларускім грамадстве фарміруецца негатыўны вобраз палякаў, выклікала бурную дыскусію прысутных.

Дакладчыкам Э. Міpановічам была закранута праблема польска-беларускіх адносін у 1939–1946 гг. Ён заўважыў неабходнасць вывучэння не толькі міждзяржаўных адносін, але і міжнацыянальных, міжканфесійных узаемадачыненняў ва ўмовах нямецкай акупацыі і ў першыя пасляваенныя гады.

Падчас сустрэчы былі падняты пытанні метадалогіі гістарычных даследаванняў. Праблема тэрміналогіі ў гуманітарнай навуцы ў сучасных

Польшчы і Беларусі была закранута ў выступленні Р. Радзіка. Вучоны заклікаў калег падчас наступных сустрэч звярнуць увагу на пытанні метадалогіі даследавання, што, на яго думку, дазволіць зблізіць пазіцыі двух бакоў. На праблему тэрміналогіі ў сучасных беларускіх школьных падручніках па гісторыі звярнуў увагу А. А. Прахараў. Ён заўважыў, што ў беларускіх вучэбных выданнях раскрываюцца ключавыя пытанні гісторыі Польшчы, у той час як у польскіх падручніках беларускі этнас фактычна не згадваецца. Больш за тое, у сучаснай Польшчы замацавалася меркаванне пра тое, што жыхары Рэчы Паспалітай (XVI–XVIII стст.) былі выключна палякамі, што не адпавядае рэчаіснасці.

Асобны блок пытанняў быў звязаны з ацэнкай падзей XVI–XVIII стст. Адрозненні ў ацэнках беларускай і польскай гістарыяграфіі ўмоў і наступстваў падпісання Люблінскай уніі разглядаў В. Ф. Голубеў, а Ф. Валяньскі адзначыў унікальнасць становішча Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) у складзе Рэчы Паспалітай. Польскі гісторык зрабіў акцэнт на шматслойнасці культурнай традыцыі на тэрыторыі былога ВКЛ у XVI–XVIII стст. Ацэнка таго, якім чынам спадчына Рэчы Паспалітай абодвух народаў прадстаўлена ў сучасных навуковых даследаваннях і гістарычнай памяці Беларусі і Польшчы, была дадзена В. С. Макарэвічам. Дакладчык звярнуў увагу на той факт, што ў сучаснай Польшчы назіраюцца спробы прысвойвання гістарычнай спадчыны гэтай дзяржавы і аспрэчвання права на яе іншых народаў.

Дыскусіі ўдзельнікаў круглага стала ў першую чаргу датычыліся пытанняў тэрміналогіі, метадалогіі даследаванняў, праблем двухбаковых адносін і ацэнкі гістарычнага мінулага ў сучасных беларускім і польскім грамадствах. Вострая палеміка разгарнулася па пытанні выкарыстання ў польскай навуцы і грамадстве гістарычнага тэрміна «крэсы ўсходнія», які, як зазначылі беларускія ўдзельнікі сустрэчы, з'яўляецца абсалютна некарэктным ў дачыненні да сучасных беларускіх зямель. У сваю чаргу польскія даследчыкі звярталі ўвагу на тое, што гэты ўстойлівы тэрмін у польскім грамадстве з'яўляецца часткай ідэалогіі дзяржавы і не мае экспансіяніцкага характару.

У сувязі з набліжэннем сотай гадавіны станаўлення беларускай і польскай дзяржаўнасці даследчыкі прыйшлі да высновы аб тым, што наступную сустрэчу неабходна прысвяціць разгляду падзей перыяду 1917–1922 гг. у гісторыі і лёсах беларускага і польскага народаў.

Такая сустрэча прайшла 29 верасня 2017 г. на гістарычным факультэце БДУ. Увазе прысутных былі прадстаўлены шэсць дакладаў, прысвечаных асобным спецыялізаваным тэмам перыяду 1917–1922 гг.

Даследчыца Я. Героўска-Калаўр на падставе выкарыстання вялікай колькасці крыніц акрэсліла геапалітычныя і палітычныя ўмовы, якія спрыялі альбо заміналі рэалізацыі нацыянальных мэт беларусаў і палякаў у 1914–1918 гг. Са свайго боку М. М. Мязга даў ацэнку праектам стварэння беларускай дзяржаўнасці. Ён ахарактарызаваў непаслядоўнасць дзейнасці адміністрацыі Ю. Пілсудскага ў дачыненні да беларускага нацыянальнага руху і абгрунтавана паказаў, што планы «федэралізацыі» не маглі прывесці да стварэння незалежнай беларускай дзяржавы.

Даследчык Э. Мірановіч засяродзіў увагу на прававой ацэнцы становішча беларускіх зямель пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы лідарамі беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы і ўрада В. Ластоўскага. На прыкладзе Мінска В. С. Макарэвіч паказаў падзеі польска-савецкай вайны і няпростую этнічную і канфесійную сітуацыю таго часу, у якой разгортваўся беларускі нацыянальны рух.

Падзеі першых гадоў пасля заканчэння польска-савецкай вайны былі прадстаўлены ў дакладах прафесара В. Сляшыньскага і дацэнта А. Г. Цымбала. Апошні звярнуў увагу на тое, якім чынам беларускае пытанне разглядалася ў нацыянальна-канфесійнай палітыцы польскіх улад у першыя гады існавання Польскай рэспублікі. Даклад В. Сляшыньскага быў прысвечаны аналізу дзейнасці беларускага падполля ў паўночна-ўсходніх ваяводствах рэспублікі ў 1921–1923 гг. Вострую дыскусію выклікала выказаная даследчыкам думка аб тым, што толькі дзейнасць асобных падрыхтаваных у Маскве атрадаў НКУС, якія пераходзілі мяжу ў той час, можна звязваць з праявамі беларускага нацыянальнага руху. Шмат хто з беларускіх і польскіх удзельнікаў выказалі нязгоду і звярнулі ўвагу на вельмі разнастайныя формы беларускага нацыянальнага руху ў межах міжваеннай Польшчы.

Напрыканцы другой сустрэчы гісторыкаў было адзначана, што дыскусіі мелі грунтоўны характар, удзельнікі выказвалі ўпэўненасць у неабходнасці працягваць абмеркаванне складаных пытанняў дзеля разумення пазіцый дзвюх нацыянальных гістарычных школ.

Урачыстым момантам сустрэчы стала падвядзенне вынікаў і ўручэнне ўзнагарод удзельнікам і пераможцам Міжнароднага беларуска-польскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па гісторыі з нагоды 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча. Конкурс быў арганізаваны гістарычным факультэтам БДУ, гісторыка-педагагічным факультэтам Вроцлаўскага ўніверсітэта і Польскім інстытутам у Мінску і праходзіў 27–29 верасня 2017 г. у Мінску. Вынікі конкурсу паказалі, што сучасныя студэнты не баяцца даваць уласную ацэнку падзеям мінулага абедзвюх краін і пры гэтым імкнуцца быць уважлівымі да пазіцыі сваіх апанентаў.

***Л. А. Козік***,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
***А. А. Прахараў***,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт